

НОВАБУДОЎЛІ ВЫХОДЗЯЦЬ НАПЕРАД 5

ШТО ПРАПАНУЕ НАМ МОДА? 13





Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЛІСТАПАДА 2018 г. АЎТОРАК № 218 (28834)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім ЕРМАЛОВІЧ, міністр фінансаў:**

*«Перагаворы аб прапрацоўцы пытання памеру кампенсацый для беларускай эканомікі з-за падатковага манеўру ў нафтавай галіне Расійскай Федэрацыі вядуцца з прыцягненнем усіх зацікаўленых. Эксперты працуюць паміж сабой, шмат тэхнічных пытанняў трэба ўрэгуляваць. Прынцыповыя ёсць пытанні. Усё трэба абмяркоўваць. Высвятляем пазіцыю сваіх расійскіх калег, разумеем, якія там ёсць асаблівасці ў гэтым працэсе. Што датычыцца тэрмінаў, у якія Беларусь і Расія дамовяцца па механізме кампенсацыі, то гэта цяжкае пытанне».*

# Мужчынскае выхаванне



Фота БелТА.

Юрый ЛІТОШЫК, выпускнік Полацкага дзяржуніверсітэта, працуе выхавальнікам у віцебскіх яслях-садзе № 52. Яго маленькім падапечным па тры-чатыры гадкі — самы цікаўны і няўрымслівы ўзрост. Але малады выхавальнік лёгка знаходзіць з імі агульную мову.

## КОРАТКА

● **Беларусь у студзені — верасні 2018 года павялічыла экспарт тавараў і паслуг у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 18 % — да $31,06 млрд.**

● Упершыню грамадзянка Беларусі стала кавалерам ордэна Імператара Японіі. Узнагароды ўдастоена народная артыстка Беларусі, выкладчык Беларускай дзяржаўнай харэаграфічнай гімназіі-каледжа Клара Малышава.



● **Нацыянальны аэрапорт Мінск укараняе сістэму самастойнай здачы багажу пасажырамі.**

● Мінск прымае міжнародны форум па барацьбе з адмываннем злачынных даходаў.

Навука для жыцця

## ЭЛЕКТРЫЧНАЯ ЦЯГА Ў БУДУЧЫНЮ

### Ужо праз тры гады ў краіне павінна быць больш за 400 ЭЗС



**Адна з самых актуальных задач, якія сёння стаяць перад навукова-прамысловым комплексам Беларусі, — распрацоўка і серыйны выпуск разнастайных відаў сучасных транспартных сродкаў на электрычнай цязе. А таксама стварэнне інфраструктуры для іх паспяховай эксплуатацыі. Зразумела, такія амбіцыйныя планы з'явіліся не на пустым месцы. Немагчыма не заўважыць, куды дзьме вецер на гіганцкай прасторы сусветнага аўтапрама. Электробусы і аўтамабілі на акумулятарных батарэях актыўна перабіраюцца з разраду экзотыкі ў катэгорыю банальнай штодзённасці. Пакуль іх не так шмат, але няма сумненняў, што ў хуткім часе яны выцесняць традыцыйных жалезных коней з іх атрутнымі выхлапамі. Наша краіна прымае меры, каб не апынуцца ў хвасце тэхнічнай рэвалюцыі. Па даручэнні Прэзідэнта Нацыянальная акадэмія навук распрацавала «Праграму развіцця электратранспарту на 2018—2022 гады». Дык якія ж перспектывы чакаюць гэты сектар беларускай эканомікі ў найбліжэйшай будучыні? Аб гэтым размова з генеральным дырэктарам Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Сяргеем ПАДДУБКАМ.**

СТАР. 4

Побач з намі

## СЯБРОЎСТВА НЕ МАЕ ПАРОДЫ

### Сацрэклама, якой нам не хапае

**«Не кідай мяне на лецішчы», «Я таксама хачу сустрэць Новы год дома» — такія кранальныя словы бачылі жыхары Масквы на білбордах з сацыяльнай рэкламай пра бяздомных жывёл. Падобныя акцыі праходзяць там пастаянна на працягу многіх гадоў, бо пытанне з вулічнымі катамі і сабакамі застаецца адкрытым і патрабуе дапамогі грамадскасці. У нас сітуацыя з бяздомнымі жывёламі не лепшая, але такой сацыяльнай рэкламы вы ў сталіцы, на жаль, не ўбачыце. Падобны праект з'явіўся сёлета ў Кобрыне. Ён прыцягнуў увагу як жыхароў горада, так і зоаабаронцаў з усёй краіны. Гэта не першы праект у гэтым горадзе, накіраваны на дапамогу, як той казаў, братам нашым меншым.**

СТАР. 13




ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# ДОБРА, АЛЕ ТРЭБА БОЛЬШ

## Прэзідэнт заклікаў удвая павялічыць грашовыя паступленні Дзяржкамваенпрама

**Аб гэтым кіраўнік дзяржавы выказаўся падчас сустрэчы са старшынёй Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Рэспублікі Беларусь Раманам Галоўчанкам.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў ведамстве забяспечваецца рэнтабельнасць і прыбытковасць, а сярэдняя зарплата значна вышэйшая, чым у іншых міністэрствах. «Усё гэта добра, але не дастаткова. Гэта палова таго, што павінна быць на канец наступнага года, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Таму плануйце свае заданні, планы стройце на будучыню з мэтай павелічэння аб'ёмаў — і нават не аб'ёмаў, а грашовых паступленняў роўна ў два разы».

«Мы вырабляем абарончыя сістэмы, гэта тое, што трэба многім дзяржавам. Мы наступаць ні на кога не збіраемся, таму трэба развіваць гэтыя школы, цэнтры, вытворчасці для таго, каб сябе забяспечваць высокаэфектыўным абарончым узбраеннем, ну і прапанаваць іншым дзяржавам. Я яшчэ раз падкрэсліваю: пераважная колькасць краін у свеце зацікаўлена ў надзейнай абароне», — дадаў ён.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб пастаўленых задачах па развіцці Дзяржкамваенпрама, а таксама развіцці галіновых дзяржаўных і прыватных прадпрыемстваў. «Натуральна, у сілу спецыфічнай прадукцыі павінен быць жорсткі кантроль і кіраванне гэтымі прадпрыемствамі з вашага боку», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Беларускі лідар таксама папрасіў Рамана Галоўчанку расказаць пра сітуацыю ў самім ведамстве, а таксама аб планах на будучыню. Нагадаем: цяперашні старшыня пачаў працаваць на сваёй пасадзе толькі з сярэдзіны жніўня бягучага года.

Па выніках сустрэчы Раман Галоўчанка пагутарыў з журналістамі. «Для таго каб выканаць задачу, якую паставіў кіраўнік дзяржавы, неабходна фарсіраванае развіццё новых напрамкаў», — сказаў старшыня Дзяржкамваенпрама.

Што гэта за напрамкі? Іх Аляксандр Лукашэнка абазначыў 5 кастрычніка на палігоне ў Даманаве: сегмент беспілотных ударных авіяцыйных комплексаў, пераход ад лёгкіх тактычных да цяжкіх ударных беспілотнікаў, якія могуць калі не замяніць пілатаваную авіяцыю, то істотна ўзмацніць яе. Развіццё гэтага сектара, упэўнены Раман Галоўчанка, падцягне ўсе сумежныя галіны навукі.

Паводле яго слоў, кан'юнктура, калі можна так выказацца, цяпер досыць спрыяльная, свет неспакойны, успыхваюць канфлікты, таму попыт на абарончае ўзбраенне і сістэмы абароны ёсць. У сувязі з гэтым беларускі ваенна-прамысловы комплекс гатовы гэты попыт задаволіць. Раман Галоўчанка выказаў надзею, што тыя распрацоўкі, якія беларускі лідар удакладніў і ўхваліў, дадуць магчымасць у будучыні выйсці на заяўленыя параметры.

Цяпер ключавы напрамак — далейшае развіццё ракетабудавання, прычым гэтыя сістэмы ў першую чаргу носяць стрымальны характар. Нягледзячы на тое, што яны прызначаны для нанясення агнявога паражэння, іх наяўнасць з'яўляецца магутным фактарам стрымлівання агрэсара.

У дадатак да ракетабудавання будуць працягваць развіваць сістэмы радыёэлектроннай барацьбы і радыёэлектроннага падаўлення, магчыма, узбраенне, пабудаванае на новых фізічных прынцыпах, такія напрацоўкі ёсць. «Без новых напрамкаў мы зможам, напэўна, толькі падтрымліваць альбо нязначна нарошчваць той аб'ём, які мы маем цяпер, а гэта ўжо больш за мільярд долараў», — дадаў ён.

Застаюцца актуальныя і напрамкі, па якіх ведамства працавала раней.

# У РАБОЧЫМ РЭЧЫШЧЫ

## Беларусь можа прапанаваць тры кандыдатуры на пасаду генсека АДКБ

**Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Азербайджанскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Лаціфам Гандзілавым.**

У пачатку кіраўнік дзяржавы адзначыў, што склалася добрая практыка, калі ён сустракаецца з пасламі не толькі ў пачатку або канцы дыпламатычнай місіі, але і непасрэдна ў працэсе работы.

Беларускі лідар расказаў, што нагода для сустрэчы добрая: літаральна праз тыдзень у нашу краіну прыляціць Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў. «У нас ёсць пра што пагаварыць, ёсць маса пытанняў, хоць, павінен сказаць, фундамент нашых адносін набірае трываласць, — сказаў ён. — За гэты год, напэўна, разы ў тры мы павялічылі тавараабарот. Гэта вельмі добры прырост, наўрад ці такі прырост ёсць з іншымі дзяржавамі, але патэнцыял наш значна большы».

Прэзідэнт падкрэсліў: у двухбаковых адносінах нашых краін ёсць куды расці і над чым працаваць. Аляксандр Лукашэнка дадаў, што задаволены супрацоўніцтвам па гуманітарным і адукацыйным напрамках. Так, каля паўтысячы азербайджанцаў атрымліваюць адукацыю ў Беларусі.

«Для Азербайджана нашы дзверы адчыненыя», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Вы павінны ведаць, што вы для нас сябры і мы заўсёды гатовыя пайсці вам насустрач. І нашы дамоўленасці з Ільхамам Гейдаравічам — гэта святое. Мы дамовіліся, што будзем іх выконваць, закрытых тэм у адносінах Азербайджана і Беларусі няма», — дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адсочвае матэрыялы ў СМІ, і заклікаў не звяртаць увагі на некаторыя разважанні. «Асабліва пасля АДКБ. Мяне здзіўляюць гэтыя домыслы і разважанні. Мы вінаватыя самі, і наш МЗС вінаваты ў тым, што мы дастаткова выразна і дакладна не інфармавалі журналісцкую супольнасць, а праз іх — грамадства нашых краін па тэматыцы перагавораў АДКБ і гэтак далей», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што ўсё ў СМІ звялося да таго, што бакі нібыта абмяркоўвалі толькі кандыдатуру будучага кіраўніка апарату АДКБ. «Так, мы абмяркоўвалі гэта пытанне, але яно заняло ў нас, напэўна, 15 хвілін. А асноўны час у нас заняло першае пытанне — знешнепалітычная сітуацыя вакол краін АДКБ», — расказаў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, натуральна, што пры абмеркаванні знешнепалітычнай абстаноўкі закранулі і ўнутрыпалітычную, аднак гэта адбывалася выключна з падачы аднаго з кіраўнікоў дзяржаў. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў Беларусі не так даўно прайшлі буйныя міжнародныя мерапрыемствы — Форум рэгіёнаў, сустрэча Асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы. Ён адзначыў, што на саміце АДКБ у Астане сам уздымаў гэтыя тэмы.

Што датычыцца прызначэння кіраўніка апарату АДКБ, то па гэтым пытанні ён заявіў, што варыянтаў была маса. «Гэта не значыць, што мы «пасунулі» Арменію, што хтосьці там перамог, а хтосьці прайграў. Пытанне ў тым, што Нікол Пашынян (выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра Арменіі. — **Аўт.**) павінен ва ўрадзе разабрацца ў сітуацыі, таму што яны ўзначальваюць сёння ЕАЭС, наш эканамічны саюз, і АДКБ. Вельмі вялікая нагрузка на краіну, якая знаходзіцца ў пераходным перыядзе», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

На яго думку, калі Нікол Пашынян разбярэцца і дасць адказ у Санкт-Пецярбургу на сустрэчы, тады і будзе прынята рашэнне. «Усё было ў спакойным рэчышчы, ніхто там не ламаў коп'і. Сапраўды, наступная краіна па алфавіце — Беларусь. Таксама нічога дзіўнага няма. І мы павінны быць гатовыя да таго, каб прапанаваць сваю кандыдатуру. У мяне тры кандыдатуры, якія я магу прапанаваць на пасаду генеральнага сакратара АДКБ. Нічога асаблівага, не — сплялі тут цэлую кучу домыслаў і размоў», — сказаў беларускі лідар.

У адказ Лаціф Гандзілаў адзначыў, што для азербайджанцаў Аляксандр Лукашэнка — гэта родны чалавек. «Наш народ вельмі вас любіць, вельмі высока вас цэніць», — адзначыў дыпламат. Ён назваў пазіцыю беларускага лідара па канфлікце ў Нагорным Карабаху крыніцай натхнення і надзеі.

Па выніках пасол расказаў журналістам, што сустрэча была звязана з будучым візітам Прэзідэнта Азербайджана ў Беларусь. Акрамя таго, асаблівае значэнне візіту надае і 25-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж нашымі дзяржавамі. Дыпламат адзначыў, што падчас візіту прадугледжваецца падпісанне каля дзесяці пагадненняў па розных галінах эканомікі, па гуманітарным кірунку.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

Парламенцкі дзённік

# Генная інжынерыя і добраўпарадкаванне тэрыторый

## Дэпутаты абмеркавалі шэраг змяненняў у законы

**Учора ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прайшло чарговае пасяджэнне. На ім члены парламента разгледзелі дзесяць пытанняў, у тым ліку ратыфікацыю міжнародных дакументаў, унясенне змяненняў у Лясны кодэкс і дапаўненні ў іншыя законы.**

**Міністр ЖКГ Аляксандр ЦЕРАХАЎ** прадстаўляў змяненні і дапаўненні ў закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь». «Праектам прадугледжана магчымасць і паўнамоцтвы мясцовых органаў улады прыцягваць юрыдычных і фізічных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў для добраўпарадкавання і падтрымання санітарнага парадку на тэрыторыях, якія прылягаюць да афіцыйна дадзеных ім участкаў зямлі. Фактычна ўдакладняецца гэта норма, якая была раней замацавана ў гэтым законе», — пракаменціраваў міністр. У цэлым змяненні плануецца ўнесці ў дзесяць артыкулаў закона.

**Алена КАЛЯСНЁВА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры і навуцы,** прадстаўляла змяненні ў закон «Аб бяспецы генна-інжынернай дзейнасці». Дапаўненні накіраваны на тое, каб прывесці дакумент у адпаведнасць з міжнароднымі дагаворамі, у тым ліку ЕАЭС.

«Змяненні ўносяцца ў працэдуру ўвозу, вывазу і транзіту праз Беларусь генна-інжынерных арганізмаў. Уводзіцца парадак ацэнкі рызык магчымых шкодных уздзеянняў на навакольны свет і здароў'е чалавека. І парадак абясшкоджвання — гэта быў прабел, — які раней не быў абазначаны. Зараз гэты парадак будзе ўстанаўлівацца Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, — пракаменціравала Алена Каляснёва. — Таксама сёння ў нейкай ступені скарачаюцца адміністрацыйныя працэдуры. Калі раней юрыдычная асоба ці індывідуальны прадпрымальнік, якія займаліся генна-інжынернай дзейнасцю, звярталіся ў Мінпрыроды, тое ў сваю чаргу — у экспертны савет для атрымання дазволу, то сёння гэта працэдура скарачаецца: індывідуальны прадпрымальнік, юрыдычная асоба можа заключыць дагавор непасрэдна з экспертным саветам аб правядзенні ацэнкі рызык магчымых шкодных уздзеянняў».

Што датычыцца адміністрацыйных працэдур, канкрэтызуюцца паўнамоцтвы Мінаховы здароўя, Мінсельгасхарча. «Генная інжынерыя — адзін з перспектыўных кірункаў біятэхналогій. І за ёй вялікая будучыня, — лічыць дэпутат. — Мы гаворым сёння і пра стварэнне новых трансгенных ліній культур у сельскай гаспадарцы: бульбы, рапсу, канюшыны, тых жа парод коз. Але, з другога боку, тых дваццаці з лішнім гадоў, падчас якіх вядуцца навуковыя даследаванні, магчыма, недастаткова для таго, каб ацаніць ступень рызыкі і ўздзеяння генных тэхналогій на чалавека і навакольнае асяроддзе». Таксама змяненні прадугледжваюць удакладненне інфармацыі на ўпакоўцы, парадку маркіроўкі і зместу дакументаў на тавар.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

Грошы

# Інфляцыя ў кастрычніку — палова працэнта

Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў мінулым месяцы ў параўнанні з вераснем склаў 100,5 %, са снежнем 2017 года — 104,2 %, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Харчовыя тавары ў кастрычніку падаражэлі на 1 % у параўнанні з вераснем і на 4,4 % у параўнанні з кастрычнікам мінулага года. Цэны на нехарчовыя тавары за месяц выраслі на 0,3 % і на 3,2 % — за год.

# Крэдыты на жыллё раптам падаражэлі

## А яшчэ ў самым вялікім банку краіны прыпынілі выдачу пазык на набыццё жылля

**Справа ў тым, што Беларусбанк з 8 лістапада павысіў працэнтныя стаўкі па крэдытах на жыллё. Раней крэдыт на ўмовах, вызначаных банкам, можна было аформіць пад стаўку 13 % гадавых (стаўка рэфінансавання плюс 3 працэнтныя пункты). З чацвярга такі крэдыт дадуць ужо пад 15 % гадавых (стаўка рэфінансавання плюс 5 працэнтных пунктаў). Аб гэтым паведамляецца на сайце банка.**

А яшчэ на сайце гэтай фінансавай установы гаворыцца, што «з 8 лістапада да 31 снежня (уключна) гэтага года прыём новых заяў грамадзян (заявак на крэдыт) на выдачу крэдытаў на набыццё жылых памяшканняў (часткі жылога памяшкання, выдзеленай у асобнае жылое памяшканне (ізаляваны жылы пакой), долі ў праве ўласнасці на жылое памяшканне), за выключэннем крэдытаў на набыццё па дагаворах куплі-продажу жылых памяшканняў, пабудаваных па дзяржаўным заказе, прыпынены».

Дарэчы, падаражэлі крэдыты не толькі на набыццё жылля, але таксама і на будаўніцтва — прыкладна на 2 працэнты. З гэтага ж дня ў Беларусбанку прыпынілі заключэнне новых дагавораў тэрміновага адзыўнога банкаўскага ўкладу ў беларускіх рублях «Класік адзыўны на 35 дзён», а таксама перастаюць заключаць новыя дагаворы па некаторых тэрміновых укладах у нацыянальнай валюце.

Асобныя фінансавыя аналітыкі звязваюць такое падаражанне са зменамі ў Банкаўскім кодэксе, якія ўступілі ў сілу 29 кастрычніка гэтага года. Банкі цяпер не могуць змяняць працэнты па крэдытах у аднабаковым парадку, а таксама навязваць кліенту дадатковую паслугу, не даўшы права выбару.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Беларускі прыклад у Парыжы


Выявы гісторыка-культурных каштоўнасцяў розных канфесій нашай краіны цяпер упрыгожваюць пасольства Беларусі ў Францыі. Аўтары большасці фатаграфій, выкарыстаных пры падрыхтоўцы выстаўкі, — Алег Лукашэвіч і Аляксандр Аляксееў.

**Днямі пасольства Беларусі ў Францыі прадставіла міжнародны выставачны праект «Беларусь. Рэлігія. Талерантнасць», падрыхтаваны пастаянным прадстаўніцтвам нашай краіны пры ЮНЕСКА сумесна з Нацыянальным гістарычным музеем Беларусі.**

Пасол Беларусі ў Францыі Павел Латушка зазначыў, што гэта вельмі сімвалічна: у дні, калі ў свеце адзначаецца заканчэнне Першай сусветнай вайны, адкрываць у Парыжы выстаўку, якая сведчыць, што на беларускай зямлі заўжды шанавалі і цэняць сёння міжнацыянальны мір і міжканфесійную згоду. Беларусь шмат цярпела ад войнаў, але сама ніколі не ініцыявала ваенных дзеянняў, нагадаў пасол, і нашы суайчыннікі вельмі добра ведаюць цану мірнага неба над галавой. Гістарычны вопыт нашай краіны, на тэрыторыі якой шмат стагоддзяў у ладзе і ўзаемаразуменні жывуць прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў, становіцца вельмі запатрабаваным у цяперашнім свеце, які перажывае ў тым ліку рэлігійныя і этнічныя крызісы.

На здымках — помнікі культавай архітэктуры, прадметы рэлігійнага культу з музейных фондаў, а таксама выявы сучаснага, насычанага і разнастайнага, жыцця канфесій, якія дзейнічаюць у Беларусі. Неўзабаве выстаўку «Беларусь. Рэлігія. Талерантнасць» плануецца прадставіць і ў іншых еўрапейскіх краінах.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**
**Фота атрымана ад пасольства Беларусі ў Францыі.**

Ведай нашых!

# Найлепшая пяціборка ў свеце

## Такога звання ўдастоена беларуска Анастасія Пракапенка

**На Кангрэсе, прымеркаваным да 70-годдзя Міжнароднага саюза сучаснага пяціборʼя, ва ўрачыстай абстаноўцы Анастасіі ўручылі ўзнагароду «Best Senior Female Pentathlete» («Найлепшы спартсмен-пяціборац сярод жанчын»). Узнагароджванне адбывалася ў рамках Гала-вячэры, у якой прынялі ўдзел высокапастаўленыя асобы, у тым ліку шэйх Ахмад Аль-Фахад Аль Сабах — прэзідэнт Асацыяцыі нацыянальных алімпійскіх камітэтаў. Усяго ў Кангрэсе прынялі ўдзел кіраўнікі федэрацый сучаснага пяціборʼя з больш чым 80 краін. Уручаў узнагароду Анастасіі прэзідэнт Федэрацыі сучаснага пяціборʼя Расіі, віцэ-прэзідэнт UIPM Вячаслаў Амінаў.**



Нагадаем, у 2018 годзе Анастасія Пракапенка стала чэмпіёнкай свету, заваяваўшы залаты медаль у асабістым заліку і ў эстафеце. Акрамя таго, на чэмпіянаце свету ў Мехіка спартсменцы быў уручаны бронзавы медаль Алімпійскіх гульняў 2008 года ў Пекіне. А крыху пазней Пракапенка ў дуэце з Ільёй Палазковым выйграла элітны Кубак Крамля. Па ацэнцы UIPM, у 2018 годзе найлепшым спартсменам свету сярод мужчын стаў Чон Ун Тхэ (Паўднёвая Карэя).

**Дарʼя ЛАБАЖЭВІЧ.**

Здарэнне

# У гандлёвым цэнтры ў Мінску абвалілася столь

**У сталічным гандлёва-забаўляльным цэнтры «Арэна-Сіці» на праспекце Пераможцаў адбылося абвальванне столевага перакрыцця. Па словах спецыялістаў, яно абрынулася на плошчы 150 квадратных метраў.**

На месцы працавала следча-аператыўная група УСК па Мінску і крыміналісты ўпраўлення. Супрацоўнікі прыступілі да правядзення агляду. Амаль адразу паведамлялася, што, магчыма, ёсць пацярпелыя, прынамсі, медыкі вырашалі пытанне шпіталізацыі ў адносінах да аднаго чалавека. Гэтую інфармацыю неўзабаве пацвердзіла прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія Барадун. «Адна пацярпелая. Яе стан — сярэдняй ступені цяжкасці. З папярэднім дыягназам «чэрапна-мазгавая траўма» яна будзе шпіталізавана ў Гарадскую клінічную бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі Мінска».

Падвясная столь уяўляе сабой лісты гіпсакардону на металічных мацаваннях. Паведамлялася, што ў выніку іх падзення пацярпела крама кветак і пункт сотавай сувязі, размешчаныя ў гандлёвым цэнтры.




Нагадаем, некалькі тыдняў таму ў польскім горадзе Жэшуве на наведвальнікаў абвалілася падвясная столь плошчай 40 на 50 метраў на першым паверсе ў адной з крамаў гандлёва-забаўляльнага цэнтра. Пацярпелі сем чалавек. На момант прыбыцця медыкаў усе яны знаходзіліся ў прытомнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надворʼе

# БАЛТЫКА ПРЫНЯСЕ НАМ МОКРЫ СНЕГ

## Невялікі мінус месцамі па краіне чакаецца ў нас нават днём

**Сёння днём мы будзем знаходзіцца на стыку двух атмасферных утварэнняў — халоднага антыцыклону з цэнтрам над Паволжам і цыклону над Вялікабрытаніяй. Іх процідборства будзе праяўляцца ва ўзмацненні ветру і паніжэнні камфортнасці надворʼя. У нашай краіне будзе воблачна і пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па паўночным захадзе магчымы невялікія ападкі, у асноўным у выглядзе дажджу, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Вецер прагназуецца паўднёвы парывісты, у асобных раёнах моцны парывісты. Максімальная тэмпература паветра ў аўторак у сярэдзіне дня — ад нуля да плюс 6 градусаў. У заходніх раёнах будзе цяплей — 7—10 цяпла. У сераду краіна апынецца пад уплывам актыўнага атмасфернага фронту, які перамяшчаецца з боку Балтыйскага мора. У многіх раёнах чакаюцца ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Па ўсходняй палове краіны месцамі магчымы галалёд, наліпанне мокрага снегу. Вецер прагназуецца пераменных напрамкаў, умераны, уначы парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да плюс 3 градусаў, па захадзе — 4—7 цяпла. Удзень будзе ад мінус 2 градусаў па ўсходзе і да плюс 9 градусаў па захадзе краіны.

У чацвер умовы надворʼя ў асноўным будзе вызначаць вільготная няўстойлівая паветраная маса. Ападкаў стане менш. У асобных раёнах эпізадычныя туманы, месцамі магчымы слабы галалёд. Вецер прагназуецца няўстойлівы, ад слабага да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, па ўсходзе — да 4 марозу. Удзень будзе ад мінус 2 градусаў па ўсходзе, да плюс 8 градусаў па захадзе краіны. Такі тэмпературны рэжым адпавядае кліматычнай норме.

**У пятніцу і суботу чакаюцца самыя халодныя ночы на гэтым тыдні.** Цыклоны і актыўныя франтальныя раздзелы будуць далёка ад нашай краіны. Таму ў шматлікіх рэгіёнах без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па поўначы краіны магчымы невялікія кароткачасовыя ападкі. Месцамі туманы, уначы і раніцай магчымы слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, а **па паўднёвым усходзе,** дзе чакаюцца больш працяглыя праясненні, **паветра будзе паніжацца да 3—6 марозу.** Удзень будзе ад мінус 1 па ўсходзе да плюс 6 градусаў у заходніх раёнах краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у нядзелю пераважна па ўсходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаюцца слабы туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да плюс 5 градусаў, удзень — ад нуля да 7 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У сектары Газа забітыя сямёра палесцінцаў і ізраільскі салдат. Нетаньяху перапыніў візіт у Парыж



Сямёра палесцінцаў загінулі ў выніку правядзення ізраільскімі сіламі ваеннай аперацыі ў сектары Газа. Як паведамляе Reuters, ізраільцяне нанеслі паветраныя ўдары і правялі рэйд. Ізраільская ваенныя паведамілі, што ў ходзе аперацыі загінуў адзін афіцэр.

Групоўка ХАМАС сцвярджае, што сутыкненне адбылося, калі з машыны, якая праязджала, адкрылі агонь па групе палесцінскіх байцоў, пры гэтым быў забіты адзін з камандзіраў. Палесцінцы сталі пераследаваць аўтамабіль, але няўдала, ён апынуўся на тэрыторыі Ізраіля. Пасля гэтага ізраільскія ваенныя самалёты выпусцілі па палесцінскай тэрыторыі больш за 40 ракет. У сваю чаргу армія Ізраіля паведаміла аб перахопе сістэмай ППА «Жалезны купал» дзвюх запушчаных з Газы ракет. Прэмʼер-міністр Ізраіля Беньямін Нетаньяху з-за сітуацыі ў сектары Газа перапыніў візіт у Парыж, дзе ён знаходзіўся на мерапрыемствах з нагоды 100-годдзя завяршэння Першай сусветнай вайны, і вярнуўся ў Ізраіль. Сітуацыя ў сектары Газа прыкметна ўскладнілася за апошні год: сутыкненні ўспыхваюць рэгулярна з-за статусу Іерусаліма.

## Столтэнберг: НАТА не збіраецца размяшчаць ядзерную зброю ў Еўропе

НАТА не плануе размяшчаць ракеты з ядзернымі боегалоўкамі ў Еўропе і заклікае Расію вярнуцца да дыялогу з ЗША па Дагаворы аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці (ДРСМД). Пра гэта заявіў у панядзелак генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг, выступаючы на канферэнцыі ў Берліне.

Разам з тым генеральны сакратар Паўночнаатлантычнага альянсу абвінавачвае Расію ў разгортванні новых ракетных сістэм, якія могуць патэнцыйна несці ядзерны зарад. «Размяшчэнне Расіяй ракет ставіць ДРСМД пад пагрозу. На працягу многіх гадоў Расія распрацоўвала, выпрабавала і выпрабоўвала новую сістэму: SSC-8 (па расійскай класіфікацыі — 9М729). Гэтыя ракеты мабільныя і цяжка адсочваюцца, яны могуць несці ядзерны зарад, што зніжае парог развязвання ядзернага канфлікту», — сказаў ён.

«Мы заклікаем Расію вярнуцца да дыялогу з ЗША», — дадаў ён. У апошнія гады паміж Расіяй і ЗША абвастрылася палеміка вакол выканання ДРСМД 1987 года. Абодва бакі абвінавачваюць адзін аднаго ў парушэннях. У Маскве пры гэтым адзначаюць, што хацелі б захаваць пагадненне.

## Астрафізікі лічаць, што астэроід Оўмуамуа можа быць пасланцом пазаземной цывілізацыі

Першы з выяўленых вучонымі астэроідаў, якія трапілі звонку ў нашу Сонечную сістэму, што атрымаў назву Оўмуамуа (па-гавайску — «пасланец здалёк»), зʼяўляецца зондам, накіраваным пазаземнай цывілізацыяй. Такую гіпотэзу выказалі астрафізікі Гарвардскага ўніверсітэта Аві Лоеб і Шмуэль Біялі. Іх даклад публікуе спецыялізаваны часопіс The Astrophysical Journal Letters у нумары, які выйшаў у свет 12 лістапада.

Як паведаміў у панядзелак тэлекампаніі NBC Аві Лоеб, незвычайная цыгарападобная форма, нехарактэрная траекторыя руху, асабліваці яго паскарэння падчас перамяшчэння ўнутры Сонечнай сістэмы адрозніваюць дадзены абʼект ад вядомых навуцы астэроідаў і камет. Даследчыкі не выключаюць, што гэта «можа быць цалкам кіраваны зонд, пасланы да Зямлі спецыяльна пазаземнай цывілізацыяй».

Астрафізікі называюць абʼект «светлавым парусам штучнага паходжання» і прызнаюць, што ў іх пакуль недастаткова навуковых звестак, каб абгрунтаваць сваю гіпотэзу.

# ЭЛЕКТРЫЧНАЯ ЦЯГА Ў БУДУЧЫНЮ

## Электракар: дзе ў ім плюс, дзе мінус?

**— Сяргей Мікалаевіч, многія эксперты лічаць, што зараз рабіць стаўку на электрычныя транспартныя сродкі вельмі рызыкоўна, бо яны разам з бясспрэчнымі перавагамі маюць і шэраг адмоўных рыс у параўнанні з традыцыйнымі. Вам як кіраўніку інстытута, які непасрэдна займаўся распрацоўкай праграмы развіцця электратранспарту ў Беларусі, безумоўна, вядомыя ўсе «за» і «супраць». У чым яны заключаюцца?**

— Рухавікі ўнутранага згарання, на якіх працуюць нашы аўтамабілі, вельмі затратныя. Нават у самых эфектыўных з іх каэфіцыент карыснага дзеяння складае ўсяго 50 працэнтаў. Гэта значыць, як мінімум палова бензіну або саляркі, што заліваюцца ў бакі, прападае дарэмна. А ККД рухавіка на электрычнай цязе набліжаецца да 100 працэнтаў. Акрамя таго, электракары не забруджваюць паветра, амаль не шумяць і ледзь не ў 8-10 разоў таннейшыя ў эксплуатацыі. Маецца на ўвазе расход паліва (бо для атрымання электрычнага току мы таксама выкарыстоўваем энергарэсурсы) і тэхнічнае абслугоўванне. Электрасілавы агрэгат у параўнанні з рухавіком унутранага згарання (РУЗ) не мае такой велізарнай колькасці дэталяў, якія з-за пастаяннага трэння патрабуюць шмат змазкі і ўсё роўна хутка выходзяць са строю. Бадай што адзіны, але надзвычай істотны мінус электракара — акумулятарная батарэя, якая павінна даваць ток. Справа ў тым, што асноўным кампанентам для яе вытворчасці з'яўляецца літый, дарагі рэдказямельны метал. Яго здабываюць толькі некалькі краін: Аўстралія, Чылі, Аргенціна, Кітай. Раней сярод іх была і Расія, але пасля распаду СССР перспектыўная вытворчасць там страчана. Толькі цяпер яе спрабуюць аднавіць. Акрамя літыю, для выпуску моцных акумулятараў патрэбен таксама кобальт, які ў асноўным знаходзіцца ў нетрах Рэспублікі Конга. Зразумела, што гэтыя краіны дыктуюць цэны на пастаўкі дэфіцытных хімічных элементаў. У выніку львіная доля кошту сучаснага электрамабіля прыпадае на батарэю, цана якой у сярэднім вагаецца ад 15 да 20 тысяч долараў. Мала таго, што праз кожныя 300—400 кіламетраў яна патрабуе зарадкі, яе агульны рэсурс разлічаны ў сярэднім на пяць гадоў.

**— І замяніць такі назапашвальнік энергіі — значыць, па сутнасці, набыць новы аўтамабіль? Уяўляю сабе саркастычную ўхмылку сярэднестатыстычнага беларуса. Як усё гэта ўвязваецца з актуальнасцю вашай праграмы, у якой стварэнне айчыннага легкавіка на электрычнай цязе займае не апошняе месца?**

— Часткова адказ на гэта пытанне заключаецца ў ім самім. Праграма датычыцца не толькі беларускага легкавога электракара, а ўсёй транспартнай галіны рэспублікі. Спынюся на ёй падрабязней. Паколькі ўжо закранулі тэму аўто для прыватных асоб, з яе і пачну. Нягледзячы на пярэчанні скептыкаў, Беларусь у стане наладзіць вытворчасць такой тэхнікі. Эксперыментальны экзэмпляр, як вядома, быў прадэманстраваны кіраўніку дзяржавы год таму. Аляксандр Рыгоравіч, выслухаўшы довады вучоных і зрабіўшы некаторыя заўвагі, падтрымаў правядзенне работ у гэтым напрамку. Дарэчы, справядліва адзначыўшы, што за такім аўтамабілем будучыня. Зараз працуем над доследным узорам машыны, якая праз некалькі гадоў павінна пайсці ў серыю. Усе элементы электрычнай сілавой установкі, згодна з праграмай, будуць распрацаваны ў нашым інстытуце і зроблены нашымі прадпрыемствамі. Напрыклад, рухавікі даручаны «Магілёўліфтмашу», электроніка і акумулятарныя батарэі — наваполацкаму ААТ «Вымяральнік». Зразумела, разлічваць на тое, што легкавы электракар адразу стане масавым, не прыходзіцца. Пра яго кошт мы ўжо казалі. Але пачаць можна з мадэляў прэміум-класа, патэнцыйныя ўладальнікі якіх менш залежаць ад цэнавай кан'юнктуры, а таксама з тых марак, якія могуць выкарыстоўвацца ў якасці гарадскіх таксі. А там, глядзіш, створым больш танную канструкцыю акумулятара. Пэўныя поспехі ў дадзеным напрамку ёсць. Прыклад — электробусы вытворчасці «Белкамунмаша», якія ўжо добра зарэкамендавалі сябе на вуліцах сталіцы. У гэтых транспартных сродках ролю накапляльнікаў электраэнергіі выконваюць кампактныя суперкандэнсатары, рэсурс якіх перавышае 100 000 цыклаў. Менавіта столькі разоў іх можна цалкам перазарадзіць. Вядома, ёмістасць такой батарэі невялікая — каля 25 кіламетраў, але гэтага дастаткова для гарадскіх пасажырскіх перавозак, улічваючы, што для перазарадкі канструкцыі патрабуецца ўсяго некалькі хвілін. Таму суперкандэнсатары знойдуць прымяненне не толькі ў электробусах, але і ў тралейбусах новага пакалення, сучасных трамваях, розных відах пагрузачна-разгрузачнай і камунальнай тэхнікі.

## Былі б ідэі, а патэнцыял ёсць

**— Па ўсім відаць, маштабы задуманага здольныя ўразіць нават самых спакушаных спецыялістаў. Ці пацягне краіна такі воз?**

— Трэба ўсвядоміць, што ўсё гэта робіцца не на голым месцы. Па-першае, вось-вось будзе ўведзена ў строй Беларуская АЭС. Мы атрымаем шмат недарагой электраэнергіі, пад выкарыстанне якой неабходна мець адпаведныя праекты. Па-другое, машынабудаўнічы комплекс краіны мае істотны патэнцыял для ажыццяўлення перспектыўных ідэй з прымяненнем інавацыйных распрацовак. Для рэалізацыі нашай праграмы створаны цэлы навукова-прамысловы кластар, куды ўвайшлі вядучыя інстытуты і прадпрыемствы. Работа вядзецца адразу ў некалькіх кірунках. Наша ўстанова выконвае мадэляванне тэхнічных рашэнняў, распрацоўвае канструктарскую дакументацыю ўсіх тыпаў электрычных машын для транспарту, у тым ліку праграмнае забеспячэнне сістэм кіравання імі, праводзіць іх стэндавыя выпрабаванні. Асобны кірунак — працяг серыйнага выпуску кар'ерных самазвалаў БелАЗ, якія камплектуюцца электрычнай трансмісіяй. Задача — удасканаліць і патанніць канструкцыю, паступова лакалізаваць тэхналогіі вытворчасці цягавага электрапрывода. Аналагічная мэта ў Мінскага трактарнага завода, дзе створаны доследны экзэмпляр прадукцыі з электрычнай трансмісіяй. Тут прыкладаюць намаганні ў стварэнні шырокай лінейкі падобных мадэляў. Нельга не адзначыць работу інжынераў і канструктараў МАЗа, дзе ў хуткім часе павінен з'явіцца грузавы электрамабіль. А спецыялісты нашага інстытута плануецца распрацоўка мадыфікацыі грузавіка з гібрыднай сілавой установкай.

**— Гэта што яшчэ за монстр?**

— Нічога незвычайнага. Машына, якая мае два рухавікі — традыцыйны, на вуглевадародным паліве, і электрычны. Іх спалучэнне можа мець мноства камбінацый. Дарэчы, тэма не новая. Наш інстытут прапанаваў укараненне такой тэхнікі даўно. Яе выкарыстанне дазваляе эканоміць да 30 працэнтаў бензіну і салляркі за кошт таго, што на малых хуткасцях, калі назіраецца іх асабліва вялікі расход, РУЗ адключаецца і замест яго пачынае працаваць электрарухавік. Перавага такой сістэмы таксама ў тым, што кіроўцу можна не хваляваць за ўзровень зарадкі акумулятара. Калі што, даехаць да месца прызначэння можна на традыцыйным рухавіку. На жаль, нас, вучоных, у свой час не пачулі. Цяпер ёсць магчымасць нарэшце наладзіць шырокамаштабны выпуск гібрыднай тэхнікі. Яе вытворчасць запланавана амаль ва ўсіх сектарах, якія мы пералічылі. Трэба таксама падкрэсліць, што праграма прадугледжвае асваенне нашай прамысловасцю важных элементаў новых відаў машын. Гэта тыя ж электрарухавікі і накапляльнікі энергіі, графенападобныя і магнітныя матэрыялы, электронныя сістэмы кіравання і праграмнае забеспячэнне, шмат чаго іншага. Акрамя інстытутаў Акадэміі навук і тых індустрыяльных гігантаў, што я ўжо назваў, да выканання пастаўленых задач далучаны акцыянерныя таварыствы «Гомсельмаш», «Амкадор», «Электрарухавік», «Этон» і іншыя.

## Ад акадэмізму да рэалій

**— Але ж гэтага мала. Для нармальнага развіцця электратранспартнай галіны неабходна мець адпаведную інфраструктуру?**

— Так. І гэта таксама адлюстравана ў праграме. Мы павінны распрацаваць і асвоіць вытворчасць станцый хуткай зарадкі батарэй для ўсіх відаў электратранспарту. А потым яшчэ і пабудаваць іх. Акрамя таго, спатрэбіцца свае тэхналогіі ўтылізацыі акумулятараў і арганізацыя вырабу такіх сістэм, дзе адпрацаваныя і зняты з машын накапляльнікі энергіі маглі б яшчэ паслужыць для іншых мэт. Акрамя таго, трэба будзе стварыць сучасную лабараторыю для выпрабаванняў як усіх вузлоў і кампанентаў нашай інавацыйнай тэхнікі, так і яе гатовых мадэляў.

**— Колькі ж грашовых укладанняў запатрабуюць усе гэтыя мерапрыемствы? Ці ёсць хаця б прыблізныя падлікі?**

— Праграма, аб якой мы вядзём гаворку, акадэмічная. Гэта, па сутнасці, толькі канцэпцыя. Вось калі яна ператворыцца ў дзяржаўную (а ў гэтым напрамку ўжо нямала зроблена), дзе будзе прапісана да дробязяў, хто і што павінен будаваць, распрацоўваць, вырабляць, у якія тэрміны, з вызначэннем крыніц фінансавання і іх аб'ёмаў, тады і можна будзе гаварыць больш прадметна. Дарэчы, зусім нядаўна ўрад зацвердзіў праграму стварэння дзяржаўнай зараднай сеткі для электрамабіляў. Ужо праз тры гады ў Беларусі павінна быць больш за 400 ЭЗС, а да 2030 года — каля 1300. Гэта з разлікам на тое, што праз 10—12 гадоў у краіне будзе не менш за 25 тысяч электракараў. Але, магчыма, працэс электрыфікацыі транспарту пойдзе хутчэй. Ва ўсякім разе краіны Еўропы адна за другой, напрыклад Францыя, Англія, Данія, пачынаюць рыхтаваць рашэнні аб забароне праз 15—20 гадоў на сваіх тэрыторыях продажу новых аўто з рухавікамі ўнутранага згарання. Па гэтым шляху ідуць таксама Індыя і Кітай. А тым часам усе сусветныя аўтагіганты актыўна распрацоўваюць новыя мадэлі электрамабіляў і выстаўляюць іх на рынак. Зараз на планеце звыш трох мільёнаў такіх машын — каля аднаго працэнта ад агульнай колькасці. Але калі прасачыць тэндэнцыю іх рэалізацыі за апошнія гады, то ўбачым рэзкі скачок угору.

## Па шляху «вікінгаў»

**— Што, на ваш погляд, неабходна зрабіць, каб развіццё электрыфікаванага транспарту ў Беларусі ішло паспяхова?**

— Як паказвае вопыт, усё залежыць ад палітыкі дзяржавы. Вось прыклад. Нават у тых краінах, дзе найбольш актыўна набываюць электрамабілі, іх колькасць ад агульнага ліку ўсё роўна не перавышае некалькіх працэнтаў. І толькі адна Нарвегія выйшла ў бясспрэчныя лідары. Там амаль трэцяя частка аўтапарка электрыфікаваная. Як жа ўдалося дасягнуць такога выніку? А справа ў тым, што дзяржава настолькі моцна стымулюе продаж электракараў, што яны, нягледзячы на больш высокую цану, акупляюцца за лічаныя месяцы. Кожны ўладальнік такой машыны штогод эканоміць на падатках і дарожных зборах 1250 долараў, на паліве — яшчэ больш за паўтары тысячы. Акрамя гэтага, дзяржава дае дадзенай катэгорыі аўтамабілістаў і іншыя льготы. У выніку электрычны транспарт развіваецца вельмі хутка. Выйграе перш за ўсё экалогія. Але, мяркую, і ў эканамічным плане ёсць свае плюсы, і з цягам часу іх значэнне будзе ўзрастаць. Бо праблему трэба разглядаць у комплексе. Мы прывыклі бачыць толькі тое, што на паверхні. А хто, напрыклад, падлічыў, колькі мы страчваем на лячэнне людзей, якія захварэлі з прычыны дрэннага паветра? Дарэчы, у буйных гарадах 80—90 працэнтаў шкодных выкідаў робіцца менавіта аўтамабілямі.

**— Словам, вучоныя прапануюць ісці шляхам Нарвегіі?**

— Гэтым шляхам ідуць і шмат іншых краін. Проста ў кожнай свае магчымасці. Беларусь таксама можа ўвесці льготы для ўладальнікаў электрамабіляў. У нашай праграме ёсць накont гэтага канкрэтныя прапановы. Напрыклад, заводам распрацоўшчыкам і вытворцам электратранспарту кароткатэрміновыя беспрацэнтныя пазыкі, вызваляць іх ад падатку на дабаўленую вартасць і ўвазных пошлін. А пакупнікам прыватных і камерцыйных электрамабіляў беларускай вытворчасці таксама даваць беспрацэнтныя пазыкі, вызваляць ад дарожных збораў, аплаты за паркоўку і ўтылізацыю, транспартнага падатку. Усім арганізацыям, якія маюць электрыфікаваныя аўто, даваць падатковыя палёгкі. Я пералічыў не ўсё. Упэўнены, што істотная дзяржпадтрымка станоўча паўплывае на станаўленне дадзенай сферы. А гэта значыць, у нас будуць развівацца інавацыйныя тэхналогіі, якія, у сваю чаргу, не толькі стануць асновай айчыннага аўтамабілебудавання, але і дапамогуць краіне заняць з гэтай прадукцыяй сваю нішу на замежных рынках.

**Гутарыў Міхаіл КАВАЛЁЎ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У тэму

## У нас з'явяцца суперхуткія электразапраўкі

**У нашай краіне плануецца ўсталяваць комплексы суперхуткай зарадкі магутнасцю да 500 кВт у гадзіну. З іх дапамогай на зарадку сучаснага электрамабіля, такога як, напрыклад, BMW i3, спатрэбіцца не больш за 10 хвілін. Прычым беларускія электразапраўкі будуць аднымі з самых магутных у свеце, гаворыцца ў сумесным паведамленні сеткі АЗС «Беларуснафта» і імпарцёра BMW і MINI ў Беларусі.**

Суперхуткія станцыі плануецца размясціць на АЗС побач з буйнымі электрычнымі падстанцыямі. Найбольшы попыт на іх чакаюць у Мінску, абласных цэнтрах і ўздоўж асноўных магістраляў краіны. Кожны комплекс будзе ўключаць па пяць зарадных прылад, а яго сумарная магутнасць складзе каля 2 МВт. Хуткасная зарадка электрамабіля на 250 кіламетраў наступнага прабегу зойме каля 8 хвілін. Праект плануецца паэтапна рэалізаваць да 2025 года.



У Еўрасаюзе падобную сетку распрацоўвае кампанія Ionity, створаная аўтагігантамі BMW, Daimler, Volkswagen і Ford. Электразапраўкі ўключаюць да шасці зарадных прылад, кожная — магутнасцю да 350 кВт.

Суперхуткія станцыі — сусветны трэнд у развіцці зараднай інфраструктуры для электрамабіляў. «Мы збіраемся развіваць яго ў Беларусі, што дазволіць спрасціць жыццё ўладальнікам аўтамабіляў з электрарухавікамі і гібрыднымі сілавымі ўстаноўкамі. Акрамя таго, гэта павысіць цікавасць да падарожжаў па Беларусі і далей — па Еўропе, а заадно паспрыяе папулярызацыі аўтатранспарту будучыні», — лічаць у сетцы «Беларуснафта».

Многае, зрэшты, будзе залежаць ад тэмпаў развіцця рынку электрамабіляў. Як чакаецца, да 2025 года на беларускіх дарогах будзе ездзіць каля 10 тысяч электрамабіляў. Гэты кірунак планує актыўна развіваць імпарцёр BMW і MINI ў Беларусі, які адкрыў першы ў краіне аўтацэнтр электрамабіляў. Сярод чаканых навінак — абноўлены электракар BMW i3 з больш ёмістай батарэяй, якая дазваляе праехаць на адной зарадцы да 360 кіламетраў. У рынку электракары вялікія перспектывы. У прыватнасці, у Нарвегіі кожны другі аўтамабіль — з электрарухавіком або гібрыдным прывадам. Мода на электракары прыходзіць і ў Беларусь, і мы разам з «Беларуснафтай» гатовыя гэтаму садзейнічаць, — адзначыў імпарцёр BMW і MINI.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Сталічная нерухомасць

# ЭФЕКТ НОВАЙ КВАТЭРЫ



## Сучасны спажывец спачатку разгледзіць прапановы на рынку першаснага жылля

**Цікавасць да новабудоўляў не толькі застаецца стабільна высокай, але і з кожным годам узмацняецца. І гэта нягледзячы на існуючыя ў гісторыі негатыўныя моманты, звязаныя з купляй кватэр на стадыі будаўніцтва. Чаму пакупнікі ўкладваюцца ў будаўніцтва, а не выбіраюць больш даступныя па цане і ўжо гатовыя кватэры на другасным рынку? Якія новыя фарматы жылля з'яўляюцца на рынку — аб гэтым у аналітычным матэрыяле кампаніі «Твая сталіца. Кіраванне праектамі».**

### ЧАС ЭКАНАМІЧНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

Канкурэнцыя паміж новабудоўлямі і другасным рынкам назіраецца пастаянна. У залежнасці ад спрыяльнасці эканамічнай абстаноўкі ў краіне яна можа толькі нарастаць або слабець. Напрыклад, лічыць **кіраўнік «Твая сталіца. Новабудцэнтр» Наталля ЖАЛАВА**, у крызісныя перыяды кольксць тых, хто адважыўся набыць недабудаваную кватэру некалькі зніжаецца — адбіваецца нежаданне людзей звязвацца з рызыкамі чакання заканчэння будаўніцтва. І наадварот, у перыяд аптымізму, выкліканага няхай невялікім, але ўсё ж ростам заробкаў, і ў цэлым, эканамічнай стабільнасці, усё больш пакупнікоў аддаюць перавагу новабудоўлям.

У апошнія гады больш за 80 % патэнцыйных пакупнікоў жылля разглядаюць новабудоўлі ў якасці альтэрнатывы кватэрам другаснага рынку. Няўжо новае жыллё прыцягвае кліентаў больш нізкім коштам? А вось і не. Гэта адна з распаўсюджаных памылак. І вось чаму.

Згодна з праведзеным кампаніяй даследаваннем, цана, як фактар уплыву на выбар кватэры, мае вагу толькі прыкладна на 20 %. Яна не пераважае над астатнімі фактарамі, такімі як месцазнаходжанне, стадыя будаўнічай гатоўнасці, інфраструктура ў наваколлі і іншае. Для параўнання — аналагічную значнасць мае размяшчэнне дома паблізу станцыі метро.

Да таго ж у цяперашні час розніца паміж коштам кватэры ў новабудоўлі і на другасным рынку ў некаторых выпадках нават стала большая. Гэта значыць, кватэры на другасным рынку ў шэрагу выпадкаў абыдуцца пры куплі танней.

### СІТУАЦЫЯ МОЦНА ЗМЯНІЛАСЯ

Яшчэ чатыры гады таму, у кастрычніку 2014 года, розніца ў коштах новабудоўляў і кватэр другаснага рынку была больш істотная. Калі параўнаць цэны таго перыяду на кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў другаснага рынку і новабудоўлі класа «Эканом», то розніца ў кошце складала ў сярэднім каля 170 долараў за квадратны метр. Гэта дазваляла сэканоміць пры куплі новай аднапакаёвай кватэры ў сярэднім 7 тысяч долараў, двухпакаёвай — 10 тысяч, а трохпакаёвай — 12 тысяч. Пры гэтым пакупнік атрымліваў цалкам новую кватэру, з больш прадуманымі планіроўкамі і запасам трываласці ўсяго дома і яго складнікаў.

Цяпер разрыў у кошце паменшыўся ў сярэднім да 50 долараў за квадратны метр. А з улікам таго, што кватэры ў новабудоўлях, як правіла больш прасторныя, чым аналагічныя па колькасці пакояў кватэры на другасным рынку, то выніковы кошт новабудоўлі можа звесці эканомію на нішто.

### ТАННЕЙ, КАЛІ НА СТАДЫІ КАТЛАВАНА

Тады ў чым сакрэт папулярнасці новабудоўляў? Бо кватэры другаснага рынку маюць хоць нейкае аздабленне, а новабудоўлі прадаюцца ў стане «голыя сцены і столь».

— Сёння можна сказаць, што асноўным фактарам цікавасці да новабудоўляў з'яўляецца так званы эфект навізны, — адзначае Наталля Жалава. — Ён грунтуецца на ўсім нам знаёмым імкненні набыць абсалютна новую рэч — кватэру, у якой да нас ніхто не жыў.

Але гэта зусім не значыць, што сэканоміць пры куплі новабудоўлі не атрымаецца. Напрыклад, на эканомію можна разлічваць, калі разглядаць новабудоўлі, якія знаходзяцца на пачатковых стадыях будаўніцтва. Або звярнуць увагу на прыгарадныя жылыя комплексы.

А накont рамонту хочацца адзначыць, што, напрыклад, большасць кватэр стандартных спажывецкіх якасцяў другаснага рынку пасля куплі таксама запатрабуюць правядзення рамонту. Не заўсёды такога маштабнага, як у выпадку новабудоўлі, але ўсё ж. Акрамя таго, некаторыя пакупнікі робяць рамонт у прынцыпе — купляючы любую кватэру, у якой да іх хтосьці жыў. А ў прыгарадных комплексах зараз можна набыць новабудоўлю з чыстым адстройваннем і па кошце ніжэй, чым кватэра другаснага рынку ў Мінску.

### РАЗВІТАЯ ІНФРАСТРУКТУРА ПЛЮС ЧЫСТАЯ ЗЯЛЁНАЯ ЗОНА

Якія яшчэ фактары ўплываюць на выбар новабудоўлі ў першую чаргу? Пасля цаны, стадыі будаўнічай гатоўнасці дома і месцазнаходжання ўлічваюцца і спецыяльныя ўмовы па аплаце (растэрміноўка і праграмы крэдытавання).

З асаблівасцяў попыту можна вылучыць, што за апошнія некалькі гадоў значна вырасла цікавасць да новабудоўляў сталічнага мікраёна Уручча, які спалучае ў сабе сучаснасць і экалагічную чысціню. Сярод пакупнікоў гэтых кватэр можна сустрэць як маладыя сем'і, так і людзей ва ўзросце, як адзінокіх прадстаўнікоў ІТ-сферы, так і работнікаў сферы культуры. Але ўсіх іх прыцягвае магчымасць карыстацца перавагамі горада і пры гэтым пражываць паблізу экалагічна чыстай зялёнай зоны.

### МАЛАПАВЯРХОВЫ ПРЫГАРАД СТАЛІЦЫ

На новы ўзровень выходзяць праекты малапавярховых жылых комплексаў, якія складаюцца ўжо не толькі з таўнхаусаў (шматкватэрныя дамы ў прыгарадзе з асобнымі ўваходамі з вуліцы), а маюць на ўвазе комплекснае напаўненне: кватэры ў сіці-хаусах (гарадскія таўнхаусы) і урбан-вілах (аднапад'ездныя невысокія дамы), дзе асобна стаяць катэджы. У папярэднія гады вопыт вывядзення падобных аб'ектаў быў не вельмі ўдалы, адзначае Наталля Жалава, плошчы дамоў былі неабгрунтавана вялікія (больш за 250 «квадратаў»), а ў наваколлі не прадугледжвалася інфраструктура. У той час як цяпер плошчы дамоў зменшыліся да прымальных для пакупнікоў 140 квадратных метраў, а кватэры ўвогуле можна знайсці плошчай ад 40 «квадратаў». Пры гэтым цана для падобных аб'ектаў «Камфорт» класа застаецца прымальнай. А пры жаданні — пакупнік можа замовіць адразу і чыставое адстройванне.

Падрыхтаваў
**Сяргей КУРКАЧ.**

Тэхналогіі

# ПРАЗРЫСТЫ КАПІТАЛ



## Тлумачым модныя эканамічныя тэрміны простымі словамі

**Блокчэйн, майнінг ды крыптавалюты не раз мусіраваліся ў СМІ, аднак многія так і не зразумелі, што гэта, як гэта працуе, і навошта гэта ўвогуле трэба. Заснавальнік кампаніі VINT Consult, эксперт у галіне блокчэйна Трафім ЯРОМЕНКА растлумачыў гэтыя паняцці і выказаўся накont перспектыў развіцця лічбавай эканомікі ў Беларусі.**

### КОРАТКА І ПА СПРАВЕ

***— Як простымі словамі растлумачыць, што такое блокчэйн і ў чым перавага сістэмы?***

— Давайце ўявім блокчэйн як бухгалтарскую кнігу. Па сутнасці — гэта база даных. У яе мы запісваем пэўныя паказчыкі. Праблема баз даных звычайна ў іх цэнтралізацыі. Напрыклад, ёсць база даных транзакцый Visa або Mastercard. І ўсе аперацыі, якія адбываюцца, адлюстроўваюцца менавіта ў гэтай цэнтральнай базе даных. Праблема цэнтралізацыі ў тым, што ўладальнік базы даных лёгка можа ўнесці ў яе змены. І ніхто пра гэта не даведаецца.

Блокчэйн змяніў месца знаходжання гэтай інфармацыі. Цяпер інфармацыя аб транзакцыях ёсць на ўсіх камп'ютарах. Яна дэцэнтралізаваная — гэта самае галоўнае. Інфармацыя размяшчаецца ў выглядзе спіса. Дык вось у бухгалтарскую кнігу, напрыклад, пасля продажу маёмасці ўносяцца звесткі, якія з'яўляюцца ў вас і ва ўсіх членаў сістэмы. Каб змяніць гэты запіс, трэба, каб яго перазапісалі на ўсіх участках сістэмы. Дазвол на запіс у сістэме (у класічнай сістэме блокчэйна) даецца з дапамогай майнінгу.

***— А што такое майнінг?***

— Гэта працэс вылічэння. Даецца класічная задача, якая рашаецца шляхам падбору лічбаў. Калі раней аперацыі можна было выконваць на найпрасцейшым камп'ютары без цяжкасцяў, то зараз патрэбны вялізныя вылічальныя магутнасці камп'ютара. Хто першы рашае задачу, той атрымлівае бонус ад сістэмы — пэўную колькасць коінаў (манет).

Хто першы рашае, той мае права запісу. Блок падпісаны, верыфікаваны і размеркаваны на ўсіх кавалках гэтай сістэмы.

